http://edoc.bseu.by



**VALERY TIKHINYA,**
**NIKOLAY RUDOVICH**

## *LEGAL BASIS FOR INTERNATIONAL CARGO AND PASSENGER AIR CARRIAGE: TRANSPORT PROBLEMS AND THEIR SOLUTIONS*

**Authors affiliation.** *Valery TIKHINYA (Minsk, Belarus), Nikolay RUDOVICH* (Roodnik@mail.ru), *Belarus State Economic University (Minsk, Belarus).*

**Abstract.** The article analyzes the issues of legal regulation of the procedure for the implementation of international air transportation. Consistent development of international transport links objectively requires uniformity in the legal regulation of transport relations between states.

**Keywords:** air transport; international transport agreement; international transportation; transport documents; transport conventions; transport links.

**UDC** 341.9

*Статья поступила*
*в редакцию 14. 02. 2022 г.*

**А. В. КОЖАР**

## *ФЕАДАЛЬНАЯ РЭНТА Ў БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА*

Аналізуецца сістэма зямельна-рэнтавых адносін у Вялікім княстве Літоўскім (ВКЛ) да сярэдзіны XVI ст. Актуальнасць тэмы абумоўлена недастатковасцю навуковых даследаванняў па гісторыі развіцця зямельнай рэнты, без якіх немагчыма фарміраванне эфектыўнай сістэмы землекарыстання на сучасным этапе. Мэта даследавання заключаецца ў аналізе формаў феадальнай рэнты і іншых падаткаў і павіннасцяў сялян ВКЛ на працягу XVI ст., а таксама выяўленне асаблівасцяў і тэндэнцый у іх развіцці. У выніку праведзенага даследавання аўтар прыходзіць да высновы, што развіццё таварна-грашовых адносін і актыўны працэс запрыгоньвання сялян выклікалі значныя змены ў структуры феадальных павіннасцяў сялянства. Да XVI ст. асноўнай формай феадальнай рэнты была натуральная. З развіццём фальваркавай сістэмы землекарыстання сяляне паўночна-заходніх і цэнтральных зямель ВКЛ у асноўным былі пераведзены на адпрацоўчую форму рэнты, якая была найбольш перспектыўнай для аднаснага павышэння даходаў феадалаў. А паўднёва-ўсходнія тэрыторыі перайшлі на грашовую форму феадальнай рэнты. Такім чынам, асаблівасцю ў развіцці землекары-

*Алена Валер'еўна КОЖАР* (lobuzova@mail.ru), *аспірантка кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (г. Мінск, Беларусь).*

стання ВКЛ было ўсталяванне змяшанай рэнты. Акрамя таго, разнастайнасць відаў і памераў падаткаабкладання сялян, адсутнасць прамой сувязі зямельнага надзела з памерамі абкладання прывялі да неабходнасці рэфармавання сістэмы землекарыстання, што і было ажыццёўлена рэформай Жыгімонта Аўгуста, якая паклала пачатак развіццю дыферэнцыяльнай рэнты за зямлю.

**Ключавыя словы:** даніна; сяляне-даннікі; сяляне-дольнікі; сяляне абложныя; паншчына; цяглыя сяляне; чынш; феадальная рэнта.

Анализируется система земельно-рентных отношений в Великом княжестве Литовском (ВКЛ) до середины XVI в. Актуальность темы обусловлена недостаточностью научных исследований по истории развития земельной ренты, без которых невозможно формирование эффективной системы землепользования на современном этапе. Цель исследования заключается в анализе форм феодальной ренты и других налогов и повинностей крестьян ВКЛ на протяжении XVI в., а также выявление особенностей и тенденций в их развитии. В результате проведенного исследования автор приходит к выводу, что развитие товарно-денежных отношений и активный процесс закрепощения крестьян вызвали значительные изменения в структуре феодальных повинностей крестьянства. К XVI в. основной формой феодальной ренты была натуральная. С развитием фольварочной системы землепользования крестьяне северо-западных и центральных земель ВКЛ в основном были переведены на отработочную форму ренты, которая была наиболее перспективной для относительного повышения доходов феодалов. А юго-восточные территории перешли на денежную форму феодальной ренты. Таким образом, особенностью в развитии землепользования ВКЛ было установление смешанной ренты. Кроме того, разнообразие видов и размеров налогообложения крестьян, отсутствие прямой связи земельного надела с размерами обложения привели к необходимости реформирования системы землепользования, что и было осуществлено реформой Сигизмунда Августа, которая положила начало развитию дифференциальной ренты за землю.

**Ключевые слова:** дань; крестьяне-данники; крестьяне-дольники; крестьяне осадные; барщина; тяглые крестьяне; чинш; феодальная рента.

**УДК** 340.153

**Уводзіны.** Рэспубліка Беларусь знаходзіцца на этапе актыўнага развіцця і рэфармавання сістэмы землекарыстання, што прыводзіць да ўзнікнення шматлікіх праблемных пытанняў, для вырашэння якіх патрэбны комплексныя тэарэтычныя, а таксама гістарычныя даследаванні ў пазначанай сферы.

Заўсёды адным з найбольш важных напрамкаў у эканоміцы з'яўляецца ўсталяванне найбольш эфектыўных форм і метадаў карыстання зямлёй і стварэнне спрыяльных умоў для фарміравання эфектыўных рэнтных зносін. Пытанні зямельна-рэнтавых адносін у першую чаргу звязаны з развіццём дыферэнцыяльнай рэнты на розных па ўрадлівасці і месцазнаходжанні землях. Гэтая праблема як у гістарычным аспекце, так і зараз застаецца актуальнай.

Навуковыя даследванні адносна гістарычнага развіцця зямельнай рэнты ў Беларусі амаль не праводзіліся. Менавіта ў сувязі з гэтым неабходны даследаванні па гісторыі развіцця зямельна-рэнтавых адносін, што дазволіць асэнсаваць папярэднія недахопы і выявіць пэўныя заканамернасці ў іх гістарычным развіцці.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца аналіз форм феадальнай рэнты і іншых падаткаў і павіннасцей сялян Вялікага княства Літоўскага на працягу XVI ст., а таксама выяўленне асаблівасцей і тэндэнцый у іх развіцці.

**Асноўная частка.** У канцы XV — пачатку XVI ст., калі канчаткова сфарміравалася саслоўе шляхты, стала вельмі распаўсюджанай з'явай дарэнне князем зямель з сялянамі феадалам за ваенную ці іншую службу, а таксама дарэнне зямель царкве. У сувязі з гэтым сяляне падпадалі пад уладу феадала, які з'яўляўся ўласнікам зямлі і абмяжоўваў правы сялян на валоданне і распараджэнне зямлёй, таму яны былі вымушаны выконваць павіннасці на карысць феадала.

Сельская гаспадарка ВКЛ у той час развівалася ва ўмовах паглыблення падзелу працы і развіцця таварна-грашовых адносін. Пачатак XVI ст. характарызаваўся пашырэннем гандлю як на ўнутраным, так і на знешнім рынках, што было выклікана ростам попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю. Як феадалы, якія атрымлівалі ад сялян феадальную рэнту, так і сяляне былі зацікаўлены ў павышэнні рэнтабельнасці сваіх гаспадарак.

Аналізуючы дакументальна-прававыя акты Вялікага княства Літоўскага, перш за ўсё пазначым, што адзінай назвы для сялян у дакументах не выкарыстоўвалася, звычайна ўзалежнасці ад асноўнай павіннасці, якую сяляне выконвалі на карысць свайго феадала, дадавалася вызначэнне іх прававога статусу: сяляне-даннікі, людзі цяглыя, людзі асадныя, сяляне-слугі і інш. Як паказваюць крыніцы, да пачатку XVI ст. асноўнай формай зямельнай рэнты для сялян была натуральная ў выглядзе даніны, што было абумоўлена ўзроўнем эканамічнага развіцця дзяржавы [1, с. *306—311*; 2, с. *316—321, 338, 340*].

Даніна была старажытным падаткам і была вядома, як сведчаць дакументы, яшчэ з IX ст. [3, с. *69*]. Выплачвалася яна з дыму ці сахі сялянамі-даннікамі ў натуральным выглядзе прадукцыяй сялянскай гаспадаркі, а часам і грашыма. Аднароднасці ў выплаце даніны не было, яе памер залежыў ад колькасці зямлі, а таксама лясных і рачных угоддзяў, якімі валодаў селянін.

Выплачвалася даніна пераважна прадуктамі сялянскіх промыслаў: мёдам, футрам, воскам. У залежнасці ад промысла, якім займаліся сяляне-даннікі, выдзялялася:

– даніна мядовая, якая выплачвалася бортнікамі або пчалярамі;

– даніна бабровая, якая давалася тымі сялянамі, што мелі бабровыя гоны, футрам ці грашыма;

– даніна кунічная, якая, як і бабровая, выплачвалася футрам ці грашыма;

– даніны лісья, вавёрчая, заечыя, гэтыя даніны часцей даваліся дадаткова да якой-небудзь іншай даніны [4, с. *52—53*; 5, с. *11, 12*].

Даніна, якая выплачвалася грашыма, мела назву грашовая ці срэбная, памер яе залежыў непасрэдна ад памеру пашавых угоддзяў, якімі валодалі сяляне.

Некалькі пазней, з актывізацыяй гаспадарчых адносін даніна стала выплачвацца сялянамі сельскагаспадарчай прадукцыяй: сенам, жытам, аўсом, курамі, яйкамі і інш. З цягам часу яна пераўтварылася ў адну з формаў феадальнай рэнты разам з грашовай і адпрацовачнай. Пры гэтым адзначым, што дакладна нельга вызначыць час, калі даніна з дзяржаўнага падатку перайшла ў форму зямельнай рэнты.

У архіўных дакументах часам узгадваюца сяляне-дольнікі, асноўным абавязкам якіх была выплата толькі чвэрці ад свайго ўраджаю. Сустракаюцца яны ў Віцебскай і Полацкай зямлі. Напрыклад, Віцебскія феадалы дамовіліся, каб людзі «пахожыя» (отчизные) былі асаджаны на чацвёртай долі [6, с. *148—149*], а Полацкая рэвізія 1552 г. замацоўвае шматлікія выпадкі, калі сяляне з раллі з усякага збожжа «чацьвёртую долю даюць» [7, с. *106—108, 110—112, 138—139*]. Пры гэтым на памежных тэрыторыях дзяржавы, дзе часта адбываліся набегі татар ці вяліся ваенныя дзеянні, таксама рабіліся

значныя палёгкі ў выплаце даніны. Так, яна магла збірацца з паловы ці трэці атрыманага прыбытку, а часам сяляне вызваляліся ад яе ўплаты цалкам [1, с. *308*; 2, с. *338*].

У XIV—XV стст. асноўнай адзінкай абкладання данінай была сялянская гаспадарка, якая называлася «дым». Пад «дымам» разумелася ўся ўласнасць, якая належала адной сялянскай сям'і. «Дым» уключаў у сябе ворыва і сенакосныя ўгоддзі, сельскагаспадарчы інвентар, працоўных жывёл і пабудовы. Зямельныя надзелы розных «дымоў» не былі аднолькавымі і залежалі ад колькасці працаздольных асоб у сям'і, ад колькасці цяглых жывёл (коней і валоў) і іншых магчымасцяў для апрацоўкі і распрацоўкі новай зямлі селянінам. На адзін «дым» прыходзілася прыкладна па 0,75 валокі зямлі [8, с. *30*]. Пры гэтым пазначым, нягледзячы на тое, што адзінкай падаткаабкладання быў «дым», у выпадку несвоечасовай выплаты даніны адказнасць накладалася часцяком на ўсё сяло ці нават на валасць.

Выплата даніны не была адзіным падаткам, які выплачвалі сяляне-даннікі. Акрамя выплаты даніны сяляне-даннікі, напрыклад, павінны былі на карысць дзяржавы выконваць шматлікія іншыя павіннасці. Па-першае, да такіх павіннасцяў адносіліся будаўніцтва і рамантаванне дарог, мастоў і замкаў. Гэтыя павіннасці мелі назву «городовое дело», «замковая работа», «мостовщизна», а часам яны называліся «служба». Па-другое, сяляне павінны былі выконваць падводную павіннасць. Яна заключалася ў прадастаўленні сродкаў перавозкі (падводаў) ганцам і паслам і іншым службовым асобам. Таксама магла заключацца ў перавозцы грузаў феадала да кірмаша ці рачнога порта. Па-трэцяе, сяляне неслі «стацыю», якая заключалася ў забеспячэнні прадуктамі харчавання падчас прыездаў вялікага князя Вялікага княства Літоўскага ці службовых асоб з велікакняжацкай адміністрацыі ў час іх знаходжання ў валасцях і паветах пры выкананні судова-адміністрацыйных і іншых функцый, а таксама забеспячэнне фуражом іх коней. «Стацыя» складалася з прадуктаў харчавання (свініны, ялавічаны, бараніны, птушак, аўса, піва, мёда і інш.). Па-чацвёртае, сяляне павінны былі ахоўваць замкі, так званая старажоўшчына. Па-пятае, на сялян накладалася выкананне «невадоўшчыны» і «езаў». Яны заключаліся ў лоўлі невадам рыбы на карысць феадала і патрабаванні рабіць езы, г. зн. загарадзі ракі, якія не давалі рыбе падымацца ўверх па плыні.

Таксама на сялян-даннікаў мог накладацца абавязак выплачваць «палюддзе», г. зн. грашовы збор, які збіраўся не з «дыму», а з асобна ўзятага селяніна. У розных валасцях Вялікага княства Літоўскага «палюддзе» збіралася па-рознаму. Яно магло збірацца адзін раз ці некалькі разоў у год. Памер яго таксама быў розным і мог складацца ад 50 коп грошай да 1,5 гроша з дыму [9, с. *173*; 10, с. *92*].

Акрамя вышэй пералічанных павіннасцяў і падаткаў, на сялян маглі накладацца і іншыя. Ужо з сярэдзіны XV ст. пачынаюць актыўна развівацца павіннасці сялян у выглядзе розных сельскагаспадарчых работ на карысць феадалаў, што было выклікана павелічэннем попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю і пашырэннем рынку збыту гэтай прадукцыі.

Як адзначае М. Спірыдонаў, да сярэдзіны XVI ст. асноўнымі рэгіёнамі, дзе былі распаўсюджаны сяляне-даннікі, былі воласці Бабруйская, Гомельская, Крычаўская, Любашанская, Магілёўская, Мазырская, Прапойская, Свіслацкая і Чачэрская [1, с. *292*].

Да сярэдзіны XVI ст. у паўночна-заходняй частцы Вялікага княства Літоўскага ўсталёўваецца фальварачная сістэма землекарыстання, і сяляне ў асноўным пераводзяцца на адпрацовачную форму зямельнай рэнты. Ад-

працоўка на панскім двары ўключала розныя віды сельскагаспадарчых работ (аранне, баранаванне, сеянне, касьбу, жніво, малацьбу і г. д.), на якія сяляне павінны былі з'явіцца на панскі двор са сваімі прыладамі — з сахой, сярпом, касой, сякерай і інш. [2, с. *73*, *78*, *273*, *449;* 11, с. *293—295*].

Паншчына ў гістарычных дакументах звычайна называлася «службай цяглай». Але часам ужываліся і іншыя тэрміны, такія як «справа», «праца» ці «прыгон». Звычайна сяляне, пераведзенныя на паншчыну, называліся «людзьмі цяглымі» [2, с. *785;* 12, с. *123*]. Свой пачатак паншчына брала з старадаўніх «талок», калі сялян зганялі на сельскагаспадарчыя адпрацоўкі на некалькі дзён у год. Паступова «талака» эвалюцыяніруе ў паншчыну як рэгулярную адпрацоўку ад аднаго да некалькіх дзён на тыдзень у залежнасці ад гаспадаркі. Пры гэтым да XVI ст. у розных памерах захоўваецца і талака. Так, у Бельскім павеце сяляне павінны былі адпрацаваць паншчыну 52 дні ў год (адзін дзень у тыдзень) і з'явіцца да феадала на талаку чатыры разы на год [13, с. *134*]. А сяляне Віцебскай зямлі ў 30-х гадах XVI ст. павінны былі адпрацоўваць па два дні ў тыдзень і хадзіць восем разоў на талаку, г. зн. яны адпрацоўвалі 106 дзён у год [14, с. *79*].

Асноўнай адзінкай абкладання сялян, да аграрнай рэформы Жыгімонта Аўгуста, была «служба», якая ў залежнасці ад павета магла насіць назву «дворище» ці «жребий» [1, с. *295*]. Пасля рэформы 1557 г. адзінкай падаткаабкладання стала валока.

Памеры паншчыны вельмі адрозніваліся ў розных валасцях. На гэта ўплывалі розныя фактары: памер сялянскага надзелу, памер панскай засеўкі, склад сялянскай сям'і, якасць зямлі і іншае. Феадалаў у першую чаргу цікавіла павелічэнне свайго прыбытку, таму яны не маглі патрабаваць непамернай працы і былі зацікаўлены ў захаванні сялянскай гаспадаркі. Так, па Полацкай рэвізіі 1552 г. сяляне Судзілаўскай воласці павінны былі адпрацоўваць на панскім двары «на год тры тыдні» [7, с. *66*], пры гэтым сяляне двара Бабцо выконвалі паншчыну толькі адзін дзень у тыдзень [7, с. *107*], сяляне двара Крывіны — па тры дні, а сяляне сяла Черсвята — «...ден в ден кром дня светого и суботы служать» [7, с. *64*], г. зн. яны працавалі на пана шэсць дзён у тыдзень.

Нажаль прасачыць эвалюцыю паншчыны да пачатку XVI ст. не прадстаўляецца магчымым з-за адсутнасці дастатковых пісьмовых крыніц і абмежаванасці звестак, замацаваных ў іх, аднак у цэлым, аналізуючы працэс развіцця паншчыны, можна адзначыць яе значнае павелічэнне на працягу XV ст. і да сярэдзіны XVI ст. Так, устава аб павіннасцях сялян Высокадварцоў 1496 г. замацоўвала паншчыну 10 дзён у год (чатыры дні араць, два баранаваць і чатыры жаць) [15, с. *108*]. Устаўная грамата Вялікага князя Аляксандра жыхарам Бельскай воласці 1501 г. змяшчае звесткі, что ў часы Вітаўта, а г. зн. да 1430 г., сяляне адпрацоўвалі паншчыну 14 дзён у год з адной валокі зямлі. Сам жа Аляксандр ужо замацоўваў, што селянін павінен адпрацаваць з валокі адзін дзень у тыдзень, а з паўвалокі адзін дзень на два тыдні, а таксама з'явіцца на чатыры дні талакі на год [4, с. *225*].

Як падкрэсліваюць вучоныя, найбольш распаўсюджаннай у сярэдзіне XVI ст. быў памер паншчыны ў два дні ў тыдзень. Па падліках даследчыкаў паншчына ў некаторых валасцях з XV ст. да канца XVI ст. вырасла больш чым у сем разоў, з 14 да 104 дзён у год [16, с. *67*]. Пры гэтым сустракаюцца звесткі і аб значна большых памерах адбыцця паншчыны. Напрыклад, у двары Быцень Слонімскага павету ў 1570 г. сяляне выконвалі паншчыну тры разы на тыдзень і хадзілі на восем талок, такім чынам адпрацоўвалі 155 дзён у год [17,

с. *282—283*]. Сяляне двара Рудаўское ў 1579 г. адпрацоўвалі 126 дзён у год [17, с. *286—288*]. Сяляне двара Косава Слонімскага павета працавалі на феадала тры дні ў тыдзень і хадзілі на 12 талок, такім чынам усяго 159 дзён [5, с. *619*]. Улічваючы тое, што на прыватнаўласніцкіх землях памер паншчыны вызначаў сам феадал, нормы яе былі вельмі рознымі, нават для сялян розных паселішчаў аднаго феадала.

Развіццю паншчыны спрыяў пераход да фальварачнай сістэмы, бо ў фальварках не мелася працоўнай сілы і амаль не было інвентара, таму феадалы былі зацікаўлены ў павелічэнні колькасці дзён, якія адпрацоўвалі сяляне. Як правіла, пасля прыняцця Уставы на валокі 1557 г., дзяржаўныя сяляне павінны былі адпрацоўваць два дні паншчыны ў тыдзень, акрамя тыдня, на які прыходзіліся вялікія святы (Каляды, Вялікдзень, Масленіца), і выходзіць на чатыры талакі [18, арт. 15], г. зн. яны адпрацоўвалі 102 дні ў год.

У сувязі з тым, што паншчына насіла прымусовы характар, яе павелічэнне выклікала ў сялян незадавальненне, аб чым сведчаць шматлікія скаргі Вялікаму князю на парушэнне феадаламі «старыны» [9, с. *195*; 13, с. *134*; 16, с. *64*, *66*]. Пра прымусовы характар паншчыны сведчаць пакаранні, якія накладаліся на сялян за адмаўленне ад працы. Так, калі селянін прапускаў адзін дзень паншчыны, ён павінен быў адпрацаваць два дні, а за пропуск двух дзён — чатыры. За прапушчаныя тры дні селянін адпрацоўваў тыдзень у ланцугах, а пасля адпрацоўкі яшчэ быў павінен аддаць пану як штраф аднаго барана. Пры далейшым ухіленні ад працы селяніна падвяргалі пакаранням. Пісцовая кніга Пінскага і Клецкага княстваў утрымлівае звесткі пра лупцаванне сялян на дыбе за ўхіленне ад працы на карысць феадала [19, с. *14—45*].

Як падкрэслівае І. А. Юхо, у найбольш цяжкім становішчы пасля рэформы знаходзіліся сяляне-агароднікі, якія, згодна з Уставай на валокі, мелі толькі па тры моргі зямлі. Улічваючы тое, што на адну валоку зямлі прыходзілася па 9—10 сямей сялян-агароднікаў, яны павінны былі адбываць па 9—10 дзён паншчыны з валокі зямлі ў тыдзень, у той час, калі цяглыя сяляне адбывалі толькі два дні ў тыдзень з валокі [20, с. *20*].

Цяглыя сяляне, асноўнай павіннасцю якіх была паншчына, выконвалі і іншыя павіннасці і выплачвалі падаткі. Звычайна яны, акрамя адпрацоўкі, павінны былі з'яўляцца на талаку, выплачвалі грошы, давалі дзякла жытам, аўсом, курамі, яйкамі і інш., а таксама выконвалі падводную павіннасць, будавалі, рамантавалі і вартавалі замкі і інш.

У пазначаны перыяд на паўднёва-ўсходняй частцы Вялікага княства Літоўскага ў якасці асноўнай формы феадальнай рэнты стала пераважаць грашовая рэнта. Сяляне, у якіх грашовая рэнта («чынш»,«аблога»,«куніца») з'яўлялася асноўнай павіннасцю, называліся «людзі абложныя», «чыншавікі» ці «кунічнікі». У першую чаргу на «чынш» пераводзіліся сяляне гаспадарскія (вялікакняжацкія), а таксама сяляне буйных феадалаў і царквы. Так, па ўставах 1514, 1529, 1542, 1547 гг., асноўнай мэтай пераводу сялян з адпрацоўчых формаў павіннасцяў на грашовую рэнту было павышэнне даходнасці вялікакняскіх маёнткаў [21, с. *XX*]. Для Вялікага князя перавод сялян на грашовыя выплаты быў больш выгадным, бо грошы прасцей паддаваліся ўліку, а скарб больш меў патрэбу ў грошах, а не харчаванні. Таму усё часцей для дзяржаўных сялян даніна, мезліва і дзякла пераводзіліся на грошы [22, с. *113—114*, *196*]. Таксама на грошы пераводзіліся і работы, якія павінны былі выканаць сяляне.

Пераход на грашовую рэнту быў выкліканы тым, што на тэрыторыях паўднёва-ўсходняй часткі Вялікага княства Літоўскага фальваркі не былі рас-

паўсюджаны, а значыць феадалам не патрабавалася прыцягваць шмат сялян для адпрацовак. Акрамя таго, развіццё таварна-грашовых адносін дазваляла сялянам выраблянь дастатковую колькасць прадуктаў на сваіх надзелах і, атрымліваючы прыбытак ад іх рэалізацыі, выплачваць феадалам чынш адразу грашыма, у чым феадалы былі зацікаўлены.

Часам сялян пераводзілі на чынш з-за геаграфічных асаблівасцяў, калі пэўныя мясцовыя ўмовы не дазвалялі з'яўляцца да двара феадала для выканання адпрацовак. Гэта магла быць аддаленасць ад панскага двара ці адсутнасць шляхоў па багністай мясцовасці. Напрыклад, пісцовая кніга Пінскага староства ўтрымлівае звесткі пра сяло Грожышч, у якім сяляне пераводзіліся на чынш замест цяглай службы, бо з-за рэк і вялікіх балот яны не маглі прыбыць на дваравыя пашы са сваімі прыладамі і валамі. Пры гэтым такое становішча не вызваляла сялян ад абавязку з'яўляцца на талаку шэсць разоў на год [19, с. *77*]. Такая самая з'ява наглядалася з сялянамі сяла Сашно, дзе з-за аддаленасці ад двара яны не маглі несці цяглую службу [19, с. *80*].

Як правіла, чынш плацілі сяляне за дадатковы надзел, які яны мелі па-за цяглым надзелам, за сялітбеную зямлю, а пасля аграрнай рэформы ўся зямля ў засценках, якая давалася сялянам, таксама пераводзілася на чынш [23, с. *8*]. Як і ў дачыненні да іншых форм феадальнай рэнты, чынш быў асноўным, але не адзіным падаткам для сялян-чыншавікоў, разам з ім сяляне выконвалі шмат іншых павіннасцяў. Памер чынша быў не вызначаны і ў кожнай мясцовасці збіраўся па-свойму. Так, у Пінскай воласці да сярэдзіны XVI ст. сяляне, якія належылі Боне Сфорцы, былі пераведзены з натуральнага падатку на чынш. Пры гэтым у сяле Маразовічы з дыму збіралася па 40 грошаў, а ў Жытновічы — толькі па 14 грошаў з дыму [19, с. *181*, *241*]. Да павіннасцяў, якія выконвалі чыншавікі, акрамя грашовай рэнты адносіліся мядовае, стацыі, падводы, маставое, а таксама сяляне вымушаны былі хадзіць на талаку.

Устава на валокі 1557 г. усталёўвала для сялян абложных выплаты чынша «съ кожъдого кгрунъту осады грошей 30, толокъ 12, або за толоки грошей дванадцать; а за кгвалъты перво уставъленые — жыта бочъка альбо грошей 10» [18, арт. 15]. Такім чынам, яны павінны былі выплачваць за абложную валоку ўсяго 52 гроша. Звыш гэтых нормаў сяляне як з абложных, так і з цяглых валок павінны былі выплаціць чынш у залежнасці ад якасці грунту. З валокі добрага грунту ён плаціўся 21 грош, сярэдняга — 12 грошаў, дрэннага («подлага») — восем грошаў, вельмі дрэннага («вельми подлого, песъковатого альбо блотливого») — шэсць грошаў. Акрамя гэтага, сяляне павінны былі выплачваць за валоку добрага і сярэдняга грунту аўса дзве бочкі, з дрэннага — адну ці за кожную бочку па пяць грошаў, за адвоз кожнай бочкі пяць грошаў, па возу сена ці тры гроша за яго і два за адвоз. Сяляне, якія мелі вельмі дрэнную зямлю, вызваляліся ад гэтых падаткаў. З кожнай валокі таксама даваліся па гусю ці паўтары гроша за яго, дзве курыцы ці 16 пенезей, 20 яек ці чатыры пенезі, два гроша на невады, за стацыю «полътретя», гэта значыць тры з паловай гроша [18, арт. 15]. Усяго абложныя сяляне за добрую зямлю плацілі 106 грошаў, за сярэднюю — 97, за дрэнную — 83, за вельмі дрэнную — 66. Такім чынам, Устава ўводзіла дыферэнцыраваную рэнту ў залежнасці ад якасці глебы.

З аналізу пісьмовых крыніц вынікае, што падаткі не заўсёды адпавядалі нормам Уставы на валокі. Часам сяляне аблагаліся дадатковымі павіннасцямі. Так, у Кобрынскай эканоміі ў 1597 г. за сярэднюю і дрэнную зямлю плацілі 104 гроша замест 97 і 83 [5, с. *587*]. У некаторых мясцовасцях з-за вельмі дрэнных зямель сяляне адмаўляліся прымаць такую зямлю, таму для іх рабіліся пэўныя палёгкі ў выплаце чыншу. Так, сяляне сяла Ельня плацілі чынш

толькі 40 грошаў і давалі аднаго вартаўніка ў замак, а сяла Рыбацкае — 30. У сяле Салоўе сяляне часова выплачвалі па 42 гроша, пакуль не распрацуюць зямлю [24, с. *222, 274, 370*]. Сустракаюцца і іншыя выпадкі часовага памяньшэння падаткаў для сялян. Тое самае назіралася і ў Пінскім старостве, дзе з-за вельмі дрэннай якасці зямлі сяляне не жадалі браць зямлю на тых умовах, якія былі замацаваны ў Уставе на валокі.

Калі параўноўваць нормы чынша, якія існавалі на дзяржаўных маёнтках пры Боне Сфорцы і пасля рэформы Жыгімонта Аўгуста, можна зрабіць вынік пра значнае павелічэнне сялянскіх павіннасцяў у другой палове XVI ст. Пры гэтым, калі ў прыватнаўласніцкіх маёнтках пераважалі цяглыя сяляне, то сярод дзяржаўных у асноўным былі чыншавікі.

**Вынікі.** Такім чынам, да сярэдзіны XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім назіралася хуткае развіццё таварна-грашовых адносін, а таксама актыўны працэс запрыгоньвання сялян, што выклікала значныя змены ў структуры феадальных павіннасцяў сялян. Да XVI ст. асноўнай формай феадальнай рэнты была натуральная і сярод сялян пераважалі сяляне-даннікі, якія выплачвалі даніну прадукцыяй сваіх гаспадарак, а менавіта збожжам, льном, канопляй, сенам, мёдам, воскам, мехам, яйкамі, курамі, гусямі і інш.

З развіццём фальварачнай сістэмы землекарыстання ў сярэдзіне XVI ст. у структуры феадальных павіннасцяў сялян адбыліся значныя змены. Так, сяляне паўночна-заходніх і цэнтральных зямель Вялікага княства Літоўскага ў асноўным былі пераведзены на адпрацовачную форму рэнты. Нізкі ўзровень вытворчых сіл, нізкі агракультурны ўзровень, недастаткова развіты ўнутранны рынак, пераход да фальварачнай сістэмы рабілі адпрацоўчую форму рэнты найбольш перспектыўнай для адноснага павышэння даходаў феадалаў.

А паўднёва-ўсходнія тэррыторыі, дзе не была дастаткова развіта фальварачная сістэма, перайшлі на грашовую форму феадальнай рэнты. У адпаведнасці з гэтым на тэрыторыі ВКЛ асаблівасцю было ўсталяваланне змешанай рэнты, у якой пераважалі паншчына і чынш. Пры гэтым акрамя асноўных форм рэнты сяляне неслі досыць вялікую колькасць іншых дадатковых павіннасцяў, што пагаршала іх эканамічнае становішча і вяло да далейшага запрыгоньвання.

Таксама трэба адзначыць, што да аграрнай рэформы ў ВКЛ назіралася разнастайнасць відаў і памераў падаткаабкладання сялян, адсутнасць прамой сувязі зямельнага надзела з памерамі абкладання і значны рост падатковага цяжару на працягу ўсяго XVI ст. Праведзеная Жыгімонтам Аўгустам зямельная рэформа паклала пачатак развіццю дыферэнцыяльнай рэнты за зямлю.

## Літаратура

1. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Экоперспектива, 2007—2011. — Т. 2. : Беларусь у перыяд Вялікага княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. — 2008. — 688 с.

2. Русская историческая библіотека, издаваемая Археографическою комиссіею : в 39 т. — СПб. : Сенат. тип., 1872—1927. — Т. 20. — 1903. — 1120 с.

3. *Вішнеўская, І. У.* Падаткі ў кантэксце станаўлення і развіцця дзяржаўна-прававой сістэмы Беларусі (IX—XVIII стст.) / І. У. Вішнеўская // Сацыяльна-эканамічныя і прававыя даследаванні. — 2008. — № 2. — С. 68—85.

*Vishneŭskaja, I. U.* Padatki ŭ kantjekscе stanaŭlennja i razviccja dzjarzhaŭna-pravavoj sistjemy Belarusi (IX—XVIII stst.) [Taxes in the context of the formation and development of the state legal system of Belarus (IX—XVIII centuries)] / I. U. Vishneŭskaja // Sacyjal'na-jekanamichnyja i pravavyja dasledavanni. — 2008. — N 2. — P. 68—85.

4. Акты, относящиеся к истории Западной России : в 5 т. — СПб. : Тип. Э. Праца. — Т. 1. 1340—1506.— 1846. — 419 с.

5. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне : Кніга Беларусі (1517—1917) : в 38 т. — 1865—1915. — Т. 14 : Инвентари имений XVI столетия (1501—1599 гг.) / предисл. И. Спрогиса, 1887. — 702 с.

6. Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах / Акадэмія навук БССР, Інстытут гісторыі : в 4 т. — 1936—1954. — Т. 1 : IX—XVIII ст. / склалі: В. К. Шчарбакоў, К. І. Кернажыцкі і Д. І. Даўгяла. — 1936. — XVI. — 678 с.

7. Полоцкая ревизия 1552 года / к изданию приготовил И. И. Лаппо. — М. : изд. Император. О-ва истории и древностей рос. при Москов. ун-те, 1905. — XXI. — 236 с.

8. *Голубеў, В. Ф.* Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі, XVI—XVIII стст. / В. Ф. Голубеў. — Мінск : Навука і тэхніка, 1992. — 173, [2] с.

*Golubeŭ, V. F.* Sjaljanskae zemleŭladanne i zemlekarystanne na Belarusi, XVI—XVIII stst. [Peasant land ownership and land use in Belarus, XVI-XVIII centuries] / V. F. Golubeŭ. — Minsk : Navuka i tjehnika, 1992. — 173, [2] p.

9. Акты Литовско-Русского государства / введ. М. Довнар-Запольского. Вып. 1: 1390—1529 г., 1899. — XII. — 258 с.

10. *Довнар-Запольский, М.* Государственное хозяйство Великого княжества Литовского при Ягеллонах / М. Довнар-Запольский. — Киев, 1901. — 809 с.

11. *Леонтович, Ф.* Крестьянский двор в Литовско-русском государстве / Ф. Леонтович. —СПб. : Тип. В. С. Балашова и К°, 1897. — Вып. 1. — 327 с.

12. Белоруссия в эпоху феодализма : в 3 т. / Академия наук БССР, Институт истории, Архивное управление МВД БССР. — Минск, 1959—1979. — Т. 1 : С древнейших времен до середины XVII века ; сост.: З. Ю. Копысский, М. Ф. Залога, 1959. — 515, [1] с.

13. Уставные земские грамоты Литовско-Русского государства: исследование кандидата прав Михаила Ясинского, удостоенное Юридическим факультетом Университета св. Владимира золотой медали и премии Н. Н. Пирогова. — Киев : Университет. тип. В. И. Завадского, 1889. — VI. — 207 с.

14. Архив Юго-Западной России, издаваемый Временною комиссиею для разбора древних актов, высочайше учрежденною при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. — Ч. 7, т. 1 : Акты о заселении Юго-Западной России : тип. Г. Т. Корчак-Новицкого, 1886. — [2], II, 85, 647, XII с.

15. Акты Литовской Метрики / собраны заслуж. проф. Император. Варшав. ун-та Ф. И. Леонтовичем. — 1896. — Т. 1, вып. 1: 1413—1498 гг. — [4]. — 169 с.

16. *Спиридонов, М. Ф.* Закрепощение крестьянства Беларуси (XV—XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов. — Минск : Навука і тэхніка, 1993. — 222, [1] с.

*Spiridonov, M. F.* Zakreposhhenie krest'janstva Belarusi (XV—XVI vv.) [Enslavement of the peasantry of Belarus (XV—XVI centuries)] / M. F. Spiridonov. — Minsk : Navuka i tjehnika, 1993. — 222, [1] p.

17. Археографический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси : издаваемый при Управлении Виленского учебного округа : в 14 т. / сост. П. А. Гильтебрандт, Ф. Г. Елеонский, А. Л. Миротворцев, 1867—1904. — Т. 3. — 1867. — XVIII. — 365 с.

18. Устава на волоки и дополняющие ее документы шестой книги Литовских публичных дел Метрики Литовской : (извлечено из XXX-го тома Русской Исторической Библиотеки) / изд. Император. Археограф. Комис. — Юрьев : Тип. К. Маттисена, 1913. — 62 с.

19. Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, составленная пинским старостою Станиславом Хвальчевским в 1552—1555 г. / предисл. К. Снитко. — Вильна : изд. Вилен. археогр. комис., 1884. — XXXII. — 714 с.

20. *Юхо, И. А.* Правовое положение населения Белоруссии в XVI в. / И. А. Юхо. — Минск : Изд-во БГУ, 1978. — 144 с.

*Juho, I. A.* Pravovoe polozhenie naselenija Belorussii v XVI v. [The legal status of the population of Belarus in the XVI century] / I. A. Juho. — Minsk : Izd-vo BGU, 1978. — 144 p.

21. *Любавский, М.* Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута: исторические очерки / М. Любавский. — М. : Университет. тип., 1892. — 884 с.

22. Акты, относящиеся к истории Западной России : в 5 т. — СПб., Тип. Э. Праца, 1846—1853. — Т. 2: 1506—1544. —1848. — 437 с.

23. *Владимирский-Буданов, Ф.* Крестьянское землевладение в Западной России до половины XVI века / М. Ф. Владимирский-Буданов. — Киев : тип. Император. Ун-та св. Владимира, В. Завадзского, 1892. — [2], 83 с.

24. Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями, изданная Виленскою комиссиею для разбора древних актов : в 2 ч. / предисл. С. Шолковича, 1881—1882. — Ч. 1. — 1881. — XXIII. — 592 с.

**ALENA KOZHAR**

# *FEUDAL RENT IN BELARUS DURING THE PERIOD OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA*

**Author affiliation.** *Alena KOZHAR* (lobuzova@mail.ru), *Belarus State University (Minsk, Belarus).*

**Abstract.** The system of land-rent relations in the Grand Duchy of Lithuania up to the middle of the 16th century is analyzed. The relevance of the topic is caused by insufficiency of scientific research on the history of the development of land rent, without which it is impossible to form an effective land use system at the present stage. The objective of the study is to analyze the forms of feudal rent and other taxes and duties of the peasants of the Grand Duchy of Lithuania during the 16th century, as well as to identify the peculiarities and trends in their development. As a result of the research, the author concludes that the development of commodity-money relations and the active process of enslavement of peasants caused significant changes in the structure of feudal duties of the peasantry. By the 16th century, the main form of feudal rent was rent in kind. With the development of the manor system of land use, the peasants of the north-western and central lands of the Grand Duchy of Lithuania were mainly transferred to the labor rent, which was the most promising for a relative increase in the incomes of feudal lords, while the south-eastern territories switched to the monetary form of feudal rent. Thus the peculiarity in the development of land use of the Grand Duchy of Lithuania was the establishment of a mixed rent. Furthermore, the variety of types and sizes of taxation of peasants, the lack of a direct connection between the land allotment and the size of taxation led to the need to reform the land use system, which was implemented by the reform of Sigismund Augustus, that initiated the development of differential rent for land.

**Keywords:** tribute; tributary peasants; obligor peasants; siege peasants; serfdom; draught peasants; chinsh; feudal rent.

**UDC** 340.153

*Статья поступила*
*в редакцию 04. 07. 2022 г.*